*В.П. ГАРМАТНЫ*

## АГРАРНАЕ ПЫТАННЕ Ў ПРАГРАМЕ БЕЛАРУСКАЙ ХРЫСЦІЯНСКАЙ ДЭМАКРАТЫІ (1917–1939)

Рассматривается отношение Белорусской христианской демократии (БХД, «хадеков») к аграрному вопросу в 1917–1939 гг., показана его эволюция в программе БХД. Отмечается, что касательно западнобелорусского крестьянства «хадеки» придерживались теории «единого потока» и считали, что белорусский народ является полностью трудящимся и бесклассовым.

The article considers the attitude of the Belarusian Christian Democracy to the agrarian question in 1917–1939 and its evolution within the program of BChD. BChD supported the theory of «common flow» in regard to Western Belarusian peasants and considered the nation to be working and classless.

Галоўным палітычным апанентам БСРГ і КПЗБ у 1920–1930-х гг. у барацьбе за ўплыў на сялянскія масы Заходняй Беларусі стала Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), якая бы-

ла створана яшчэ ў маі 1917 г. у Пецярбургу і прыкладна да сярэдзіны 1920-х гг. называлася «Хрысціянска-дэмакратычная злучнасць» (ХДЗ)[1]. На чале хрысціянскіх дэмакратаў («хадэкаў») стаялі ксяндзы беларускага паходжання Фабіян Абрантовіч, Адам Станкевіч, Вінцэнт Гадлеўскі і інш. На працягу кастрычніка 1917 – красавіка 1937 г. і лістапада 1939 – ліпеня 1940 г. кіраўніцтва БХД выдавала газету «Крыніца» («Krynica», з 1925 г. «Беларуская крыніца», «Bielaruskaja krynica»)[2].

У сярэдзіне 1920-х гг. БХД стала самай уплывовай сярод заходнебеларускіх нацыянальна-дэмакратычных арганізацый і прымала актыўны ўдзел у абмеркаванні аграрнага пытання, якое было самым актуальным і злабадзённым для заходнебеларускага насельніцтва. Усяго на працягу 1917–1939 гг. прынята 5 праграм БХД (1920, 1927, 1928, 1932 і 1936 гг.), у якіх паслядоўна адстойваліся асновы дэмакратычнага ладу і найперш за ўсё права прыватнай уласнасці.

На думку аўтараў праграм БХД, прыватная ўласнасць (у тым ліку і на зямлю) з’яўляецца асновай любога цывілізаванага грамадства[3], аднак хадэкі выступалі за яе абмежаванне і дэкларавалі неабходнасць пераходу буйной уласнасці ў калектыўнае карыстанне[4]. Прадстаўнікі БХД адмаўлялі капіталізм як лад жыцця, але разам з тым рэзка негатыўна адносіліся да Савецкага Саюза і марксісцка-ленінскай тэорыі класавай барацьбы[5]. Так, у другім пункце першай праграмы БХД (1920) падкрэслівалася, што «Хрысціянская дэмакратыя змагаецца перад усімі з капіталізмам, у каторым бачыць адну з найважнейшых прычын беднасці і галечы працоўных мас і хоча завесці такі лад, каб кожнаму чалавеку магчыма было сваёй працай здабыць сабе хлеб патрэбны і карыстацца з усяго культурнага багацця»[6].

БХД выступала за самастойнасць беларускага народа на ўсёй тэрыторыі яго пражывання (гэта значыць у тым ліку і ў тагачаснай БССР) і за стварэнне дэмакратычнай рэспублікі[7]. У аснову праграмы хрысціянскіх дэмакратаў было пакладзена сцвярджэнне, што беларускі народ з’яўляецца бяскласавым і цалкам працоўным («сярмяжным»)[8]. Патрабаванні перадачы зямлі без выкупу беззямельным і малазямельным сялянам Заходняй Беларусі ва ўласнасць, абмежавання буйной зямельнай уласнасці праз падаткаабкладанне, арганізацыі кааператываў і курсаў узаемадапамогі, мясцовага самакіравання, спынення ўрадавай палітыкі насаджэння вайсковага асадніцтва, падзел дзяржаўнай зямлі з мэтай стварэння малых асабістых гаспадарак, а таксама дэмакратычных свабод і правоў знаходзілі шырокі водгук сярод заходнебеларускага насельніцтва пераважна каталіцкага веравызнання[9].

Адным з самых значных даследаванняў па ацэнцы стану развіцця сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі міжваеннага перыяду стала праца Антона Пінчука (Пінкевіча) «Сучаснае палажэнне беларускай вёскі» («Беларуская крыніца», 1935, № 19, 32). У выніку праведзенага падрабязнага статыстычнага аналізу аўтар разглядаемага артыкула прыйшоў да шэрагу значных высноў, якія ахарактарызавалі сучасны яму стан сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі. А. Пінчук адзначаў, што ў заходнебеларускай вёсцы ў гэты час ішоў працэс хуткага драбнення сялянскіх гаспадарак, што адбывалася адначасова з павелічэннем сялянскага насельніцтва, з-за чаго замаруджвалася рацыяналізацыя вытворчасці. Па меркаванню аўтара дадзенага артыкула, хутарызацыя павінна была ісці паралельна з прырэзкамі зямлі і сутнаснай дзяржаўнай дапамогай[10].

У сваім даследаванні А. Пінчук неаднаразова спасылаўся на працы вядомага тагачаснага польскага вучонага-аграрніка і дзяржаўнага дзеяча Вацлава Студніцкага аб колькасці неабходнай прырэзкі зямлі сялянам усходніх ваяводстваў II Рэчы Паспалітай і лічыў гэтую меру недастатковай у сувязі з агульнай нізкай культурай мясцовага сялянства, у тым ліку і сельскагаспадарчай, а таксама недахопам у Заходняй Беларусі элементарных пачатковых школ[11].

Аўтар азначанага артыкула разгледзеў прычыны заняпаду сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі і прыйшоў да высновы, што гэта звязана з памяншэннем коштаў на сельскагаспадарчую прадукцыю, якое прыводзіць да павелічэння эксплуатацыі вёскі горадам. Кааперацыя не атрымала дастатковага развіцця ў сувязі з недахопам грошай у мясцовых сялян. Акрамя таго, пагаршэнне становішча заходнебеларускіх сялян звязана з вялікім падатковым цяжарам і высокімі натуральнымі павіннасцямі (нават для гаспадарак з надзелам каля 10 га адбыванне натуральнай павіннасці ў 25–30 дзён вясной і восенню абцяжарвае вядзенне рацыянальнай гаспадаркі). У сувязі з крызісам у тагачаснай прамысловасці «Крэсаў Усходніх» для заходнебеларускіх сялян страчвалася магчымасць перасялення ў горад.

Паводле меркаванняў А. Пінчука, выйсце з такой сітуацыі магло быць знойдзена ў развіцці хатніх промыслаў, але яны ўжо даўно манапалізаваны цэхамі, якія дыктуюць кошты на рынках. Агульная выснова аўтара артыкула была наступнай: калі раней прычынамі неразвітасці сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі з’яўляліся мясцовыя прыродныя умовы, то цяпер у існуючых аграрных адносінах адзіным выйсцем з такой сітуацыі даследчык лічыў аб’яднанне беларускіх сялян па прыкладу рабочых, гандляроў, рамеснікаў і буржуазіі[12].

Паколькі зямля ў аграрным пытанні ў разглядаемы перыяд займала цэнтральнае месца, неабходна адзначыць, што БХД лічыла непрымальным чысты лібералізм у аграрных адносінах па прычыне несправядлівага падзелу ворнай

зямлі паміж яе ўласнікамі. Развіццё капіталізму ў заходнебеларускай вёсцы прывяло да канцэнтрацыі значнай колькасці зямлі ў адных руках і адсутнасці яе ў большасці насельніцтва, што несправядліва, улічваючы малую колькасць зямлі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, прыдатнай для вядзення сельскай гаспадаркі[13]. Разам з тым кіраўніцтва БХД падкрэслівала, што шлях рэфармавання сельскай гаспадаркі, ажыццёўлены ў СССР, аказаўся няправільным, бо пры гэтым сяляне сталі рабамі дзяржавы (дзяржава забірае ў іх столькі прадуктаў, колькі хоча).

Трэці шлях, прапанаваны БХД, заключаўся ў наступным: зямля перадаецца сялянам у карыстанне, а не ва ўласнасць. Такая тэорыя атрымала назву народна-сацыялістычнай і мела па меркаванню яе аўтараў як станоўчыя, так і адмоўныя бакі[14]. Станоўчым бокам народна-сацыялістычнай тэорыі стала немагчымасць канцэнтрацыі зямлі ў адных руках не на карысць іншым, адмоўным – магчымасць пераўтварэння сялян у нявольнікаў пры ліквідацыі прыватнай уласнасці на зямлю, што і было ажыццёўлена ў СССР. Лідары БХД лічылі, што заходнебеларускім сялянам найбольш прыдатны сярэдні шлях землеўпарадкавання: перадача сялянам зямлі ва ўласнасць пры істотным абмежаванні з боку дзяржавы магчымасці яе канцэнтрацыі ў адных руках[15].

У дыскусіях па формах і метадах сялянскага землекарыстання БХД займала выразную пазіцыю падтрымкі польскай урадавай палітыкі хутарызацыі (камасацыі) пры ўмове абавязковай дапамогі з боку дзяржавы і згоды сялян на сваіх сходах: «БХД змагаецца за такое ўпарадкаванне зямлі і за такую зямельную гаспадарку, якая давала б найбольш прыбытку грамадству і дзяржаве. Такою гаспадаркаю БХД лічыць працу на хутарах ці на супольных зямельных надзелах (водрубах)»[16]. Зямля перадавалася сялянам па працоўнай норме, якая (звычайна 10–15 га) залежала ад таго, колькі могуць апрацаваць гаспадар са сваёй сям'ёй ці пры дапамозе аднаго-двух сельскагаспадарчых рабочых (п. 39 праграмы 1928, 1932 гг.), але наёмныя рабочыя дапускаліся толькі пры ўмове старасці, хваробы, калецтва ці ўдаўства гаспадароў зямлі[17].

На старонках перыядычных выданняў БХД, перш за ўсё «Беларускай крыніцы» і часопіса «Саха»[18], даказвалася немагчымасць эфектыўнага вядзення асабістай сялянскай гаспадаркі на аснове прынятай у Заходняй Беларусі шнуравой сістэмы (пры цераспалосіцы). Паводле меркаванняў кіраўніцтва БХД, «хутарская сістэма – гэта ідэальная сістэма сялянскай гаспадаркі, дзякуючы якой селянін можа свабодна прымяняць тэхнічныя ўдасканаленні, мінеральныя ўгнаенні і г. д., а галоўнае, што гэтаю сістэмаю можа быць дасягнуты "поўны спакой сялянства"»[19]. Разам з тым «вобак (акрамя) прыватных зямельных гаспадарак могуць існаваць і гаспадаркі калектыўныя, дзе гэтага хочуць людзі, а такжа дзе гэтага вымагае агульнаграмадскае дабро»[20].

Прадстаўнікі БХД падрабязна разглядалі такія адмоўныя бакі развіцця сялянскай гаспадаркі ў вёсцы, як цяжкасць апрацоўкі зямлі і залежнасць ад суседзяў. Прыведзеныя даследчыкамі разлікі даказвалі, што ў сярэднім з 1 шнура (сялянскай палоскі) здымаецца 30–40 пудоў з 1 га, а на адным надзеле – 70–80 пудоў, такім чынам нават пры элементарным звядзенні зямлі ў адзін надзел селянін можа палепшыць сваё эканамічнае становішча ў 2 разы. БХД адзначала, што для малазямельных сялян пераход на хутары застаецца вельмі цяжкім і немагчымым без дапамогі дзяржавы[21].

Кіраўніцтва БХД лічыла, што заява польскага ўрада ў 1918 г. з абяцаннем даць зямлю сялянам і прыняцце 15 ліпеня 1920 г. закона аб аграрнай рэформе звязаны з першаснай дэмакратызацыяй краіны ў перыяд яе ўтварэння і Савецка-польскай вайны. У далейшым жа гэты закон так і застаўся на паперы, а Вярхоўны Суд ІІ Рэчы Паспалітай так пракаментаваў яго, што звёў па сутнасці да адной парцэляцыі (продажу сялянам зямлі невялікімі надзеламі – парцэламі), а ўслед за ёю і зямельнай спекуляцыі. Абвал польскай нацыянальнай валюты (маркі) на пачатку 1920-х гг. спрыяў уздыму эканамічнага становішча памешчыкаў праз абясцэньванне ўзятых імі пазык і крэдытаў, а ўвядзенне з 1924 г. у фінансавы абарот новай польскай валюты – злотага – падарвала канкурэнтаздольнасць польскай прамысловасці.

Адносна прынятага Сеймам ІІ Рэчы Паспалітай 28 снежня 1925 г. новага закона аб правядзенні аграрнай рэформы БХД адзначала, што ён быў выдадзены пад націскам народных мас і меў на мэце пакласці канец спекуляцыі зямлёй і звесці ўсю рэформу да насаджэння асадніцтва. Кіраўніцтва БХД прааналізавала заканадаўства аб ліквідацыі сервітутаў (сумеснага зямельнага карыстання) і прыйшло да высновы, што яно практычна нічога не дае заходнебеларускім сялянам, паколькі амаль усе былыя сервітутныя землі пераходзяць ва ўласнасць памешчыкаў ці асаднікаў (каланістаў-перасяленцаў з тэрыторыі карэннай Польшчы).

БХД прызнавала неабходнасць правядзення меліярацыйных работ на Палессі, аднак адзначала тую асаблівасць, што польскі ўрад, які ў 1928 г. распрацаваў план асушэння балот, ставіў перш за ўсё не эканамічную, а палітычную мэту – польскую каланізацыю Заходняй Беларусі. Такая выснова была зроблена кіраўніцтвам БХД на падставе таго факта, што асушаныя землі перадаваліся пераважна не заходнебеларускім сялянам, а асаднікам. Акрамя таго, падкрэсліваліся і крыніцы фінансавання меліярацыйных работ: 40 % – дзяржаўныя сродкі, 40 % – сродкі мясцовых органаў улады і 20 % – сродкі мясцовых ся-

лян. Такім чынам, БХД ставілася да аграрных мерапрыемстваў польскага ўрада даволі крытычна і лічыла іх недастатковымі для кардынальнага вырашэння ў краіне зямельнага пытання[22].

Кіраўніцтва БХД бачыла галоўную прычыну беднасці сялян Заходняй Беларусі ў іх малазямеллі, а таксама ў ненавядзенні парадку ў асабістых сельскіх гаспадарках і неналежным планаванні далейшага развіцця гаспадаркі: «Гаспадар, які вядзе гаспадарку без плана, ніколі не даб'ецца станоўчых вынікаў»[23]. У якасці станоўчага вопыту падкрэслівалася сельская гаспадарка Скандынаўскіх краін, і асабліва Даніі. Сама па сабе пастаноўка пытання аб планаванні на ўзроўні сялянскай гаспадаркі сведчыла аб вызначаным крэне БХД да дзяржаўнага рэгулявання і арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці на ўзроўні першаснага звяна[24].

Характэрнай асаблівасцю дзейнасці БХД з'яўлялася спроба вырашэння аграрнага пытання не толькі ў тэарэтычным плане, але і на практыцы. Аб гэтым можна меркаваць па распрацоўцы і абгрунтаванню важнасці рахункаводства ў асабістых сялянскіх гаспадарках, канкрэтных рэкамендацыях, а таксама па распаўсюджванню перадавога вопыту вядзення сельскай гаспадаркі. З гэтай мэтай на старонках уласнага часопіса «Саха» сялянам даваліся рэкамендацыі па ўліку сабекошту выпускаемай прадукцыі, прыбыткаў і затрат, даваліся тлумачэнні па складанні інвентарных вопісаў, кніг прыходаў і даходаў і г. д.[25]

У прамую заслугу БХД можна паставіць выданне інжынерам-хадэкам А. Клімовічам даследавання «Земляробская чытанка», у якім аўтар падрабязна разгледзеў асабістую сялянскую гаспадарку тагачаснай Заходняй Беларусі, асноўныя спосабы і метады вядзення сельскай гаспадаркі, асаблівасці заходнебеларускага раслінаводства і жывёлагадоўлі[26], і падручніка «Асновы земляробскай эканомікі» (1937). А. Клімовіч проста і даступна разгледзеў найбольш складаныя і дыскусійныя тэарэтычныя пытанні эканомікі, не навязваючы асабістага пункту гледжання. Усе асноўныя эканамічныя катэгорыі (даход, прыбытак, рызыка прадпрыемцы і г. д.) разглядаліся з пазіцыі тэорыі трох фактараў вытворчасці: зямлі, працы і капіталу. Пры гэтым аўтар падручніка падкрэсліваў, што ў апошні час узаемаадносіны гэтых фактараў набылі спецыфічныя рысы: зямля стала ўсё больш інтэнсіўна выкарыстоўвацца ў выніку павышэння колькасці насельніцтва і абмежавання зямельных рэсурсаў, сутнасна ўзрасла роля і патрэба ў вытворчым капітале[27].

У якасці галоўнай праблемы заходнебеларускіх сялян БХД-БНА прызнавала зямельны голад і даволі крытычна ставілася да ажыццяўляемай польскім урадам аграрнай палітыкі. Па меркаванню кіраўніцтва БНА, зямельная рэформа не закранала памешчыцкія землі, а сялян прымушала ў пошуках працы перасяляцца ў горад для працаўладкавання перш за ўсё ў сферы прамысловасці ці гандлю. У сувязі з гэтым БНА рабіла выснову, што такая аграрная рэформа не вырашала зямельнага голаду канчаткова, і таму арганізацыя выступала за бясплатнае надзяленне зямлёй беззямельных і малазямельных сялян Заходняй Беларусі па максімальнаму і мінімальнаму памерах, усталяваных урадам. Разам з тым ксёндз В. Гадлеўскі прапаноўваў, каб касцёл і царква адмовіліся ад належачых ім земляў і перадалі іх сялянам без выкупу.

Акрамя таго, БХД адзначала, што для ўздыму сельскай гаспадаркі неабходна «арганізоўваць асветніцка-гаспадарчыя гурткі, касы, бібліятэкі-чытальні, курсы, малочныя; пры дапамозе сваёй арганізацыі мы (сяляне Заходняй Беларусі) навучымся як лепш апрацоўваць зямлю, вырошчваць жывёлу і дзе лепш прадаваць свой тавар. Такім і толькі такім шляхам мы дасягнем веды і капітал і тым самым вызвалімся ад сапраўднага гора» («Беларуская крыніца», 1928, 12 кастр.)[28], а таксама неабходна «арганізаванасць, павышэнне свядомасці і выхаванне сялянства, рабочых і інтэлігенцыі на аснове дэмакратыі і беларускай народнай культуры»[29].

Падводзячы вынікі, адзначым, што калі першапачаткова сацыяльнай базай БХД выступала перш за ўсё мясцовае насельніцтва рымска-каталіцкага веравызнання, то з цягам часу арганізацыя распаўсюдзіла свой уплыў і на праваслаўных. Вынікам гэтага працэсу стала прыняцце ў студзені 1936 г. больш радыкальнай пятай праграмы і змяненне назвы на Беларускую нацыянальную асацыяцыю (БНА)[30]. Паводле праграмы БНА, членам партыі мог быць беларус любога веравызнання, якому блізкія «імкненні да незалежнасці беларускага народу на абшары ўсіх яго этнаграфічных земляў, аб'яднаных у адзіны дзяржаўны арганізм, дэмакратычныя лозунгі роўнасці і грамадзянскай справядлівасці супраць усялякіх формаў дыктатуры: капіталізму, фашызму і камунізму»[31].

Такім чынам, па аграрнаму пытанню БХД-БНА арыентавалася на стварэнне ў Заходняй Беларусі эканамічна моцных асабістых сялянскіх гаспадарак фермерскага тыпу, выступала за вырашэнне зямельнай праблемы шляхам рэформаў і ў сувязі з гэтым падтрымлівала ўрадавую палітыку хутарызацыі (камасацыі) пры ўмове аказання дзяржавай дапамогі пераходзячым на хутар сялянам. За гады свайго існавання (1917–1939) ХДЗ-БХД-БНА прайшла доўгі і складаны шлях ад клерыкальна-дэмакратычнай да свецка-клерыкальнай арганізацыі дробнабуржуазнага напрамку.

[1] Гл.: Коўкель І. І. Беларуская хрысціянская дэмакратыя і яе роля ў беларускім грамадска-палітычным руху (1917–1939 гг.) // Этносоциальные и конфессиональные процессы в трансформирующемся обществе: Материалы Междунар. науч. конф.: В 2 ч. Гродно, 2001. Ч. 2. С. 41; Палітычныя партыі Беларусі. Мн., 1994. С. 78.

[2] Гл.: Brzoza Cz. Polska w czasach niepodleglosci i Drugiej Wojny Swiatowej (1918–1945). Krakow, 2001. S. 83; M o r o z M. «Krynica»: Ideologia i przywodcy bialoruskiego katolicyzmu. Bialystok, 2001. S. 61–62.

[3] Гл.: Ладысеў У.Ф. Насуперак волі народа: з гісторыі палітычнага банкруцтва беларускіх нацыяналістычных партый і арганізацый Заходняй Беларусі (1934–1939 гг.). Мн., 1976. С. 27; Палітычныя партыі Беларусі. Мн., 1994. С. 80.

[4] Гл.: Вашкевіч А.Ф. Эвалюцыя Беларускай хрысціянскай дэмакратыі ў святле яе палітычных праграмаў (1917–1939) // Спадчына. 2006. № 1. С. 24.

[5] Гл.: Ладысеў У.Ф. Указ. тв. С. 29.

[6] Палітычныя партыі Беларусі. Мн., 1994. С. 79; Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине / Под ред. С. Скульского. Мн., 1935. С. 269.

[7] Гл.: Brzoza Cz. Op. cit. S. 83.

[8] Гл.: Ладысеў У.Ф. Указ. тв. С. 26.

[9] Гл.: Полуян В.А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939 гг.). Мн., 1978. С. 240.

[10] Гл.: Экономическая мысль в Западной Беларуси в 1921–1939 гг. / В.Н. Бусько и др. Мн., 2004. С. 85.

[11] Гл.: Мазько Э.А. Этнічныя і канфесійныя аспекты культурна-асветніцкай дзейнасці Беларускай хрысціянскай дэмакратыі ў Заходняй Беларусі ў першай палове XX стагоддзя // Этносоциальные и конфессиональные процессы в трансформирующемся обществе: Материалы Междунар. науч. конф.: В 2 ч. Гродно, 2001. Ч. 2. С. 46–47.

[12] Гл.: Экономическая мысль… С. 85.

[13] Гл.: Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине / Под ред. С. Скульского. Мн., 1935. С. 269.

[14] Гл.: Палітычныя партыі Беларусі. С. 81.

[15] Гл.: Вашкевіч А.Ф. Указ. тв. С. 26; Экономическая мысль… С. 86–87.

[16] Ладысеў У.Ф. Шлях да свабоды: з гісторыі рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гг. Мн., 1978. С. 45; Палітычныя партыі Беларусі. С. 80.

[17] Гл.: Вашкевіч А.Ф. Указ. тв. С. 25–26.

[18] Гл.: Экономическая мысль… С. 87; Moroz M. «Krynica»: Ideologia i przywodcy bialoruskiego katolicyzmu. Bialystok, 2001. S. 138, 199.

[19] Политические партии… С. 271.

[20] Палітычныя партыі Беларусі… С. 84.

[21] Гл.: Экономическая мысль... С. 87.

[22] Гл.: Палітычныя партыі Беларусі… С. 80.

[23] Экономическая мысль… С. 88.

[24] Гл.: Политические партии… С. 269.

[25] Гл.: Экономическая мысль… С. 89.

[26] Гл.: Klimovic A. Ziemlarobskaja cytanka (1 cz.). Vilnia, 1932.

[27] Гл.: Экономическая мысль… С. 84.

[28] Гл.: Ладысеў У.Ф. Указ. тв. С. 27–28.

[29] Полуян В.А. Указ. тв. С. 94.

[30] Гл.: Мазько Э.А. Ідэалагічныя падставы дзейнасці Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (1917–1939 гг.) // Гістарычны альманах. Гродна, 2000. Т. 3. С. 73.

[31] Вашкевіч А.Ф. БХД і КПЗБ: ад супрацьстаяння да супрацоўніцтва. 1935–1938 гг. // Берасцейскі хранограф. Брэст, 2004. Вып. 4. С. 114–115; Полуян В.А. Революционно-демократическое движение... С. 270.

Паступіў у рэдакцыю 02.11.10.

***Віталь Пятровіч Гарматны*** – аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар П.І. Зялінскі.